Г.К. ЧАХОЎСКІ

# ДА ПЫТАННЯ АБ КАМУНІКАТЫЎНАЙ ПРЫРОДЗЕ ПАЛІТЫЧНАГА ДЫСКУРСА
## (на матэрыяле дакументаў па гісторыі Беларусі 20–30-х гг. XX ст.)

Исследуется одна из актуальных проблем современного языкознания – генерирование политического дискурса. Рассматривается новая модель текстопорождения – с актуализированной стадией формирования содержания при отсутствии деления на предречевые и речевые его этапы.

One of the current problems of modern linguistics – generating political discourse – is investigated. The new model of text generating (including a content forming stage without dividing into pre-speech speech phases) is regarded.

У сучаснай лінгвістычнай навуцы да ліку найбольш актуальных і недастаткова вывучаных адносяцца пытанні выяўлення сутнасці палітычнага дыскурса – складанай камунікатыўнай з'явы, якая змяшчае звесткі аб сацыяльным кантэксце, удзельніках палітычнай камунікацыі, а таксама аб механізме раскрыцця семантыкі тэксту (уздзеянне на адрасата). У беларускім мовазнаўстве праблемы кагнітыўна-рытарычнага аналізу палітычнага дыскурса яшчэ не атрымалі дастатковага асвятлення. Не існуе пакуль адзінага пункта погляду наконт прыроды ідэалагічна актуалізаванага тэксту, што, з аднаго боку, абумоўлена шырокай аспектызацыяй названай праблемы і наяўнасцю розных падыходаў да яе вырашэння, а з другога – адсутнасцю спецыяльных прац у гэтай галіне. Нявысветленымі застаюцца адзінкі апісання структур свядомасці, якія маюць тэкставыя карэляты. Апошнія не вывучаліся зусім або разглядаліся спарадычна толькі ў кантэксце аналізу іншых лінгвістычных праблем. Невыпадкова нават сам тэрмін *«дыскурс»* часта атаясамліваецца з тэрмінам *«тэкст»*, хоць гэтыя паняцці далёка не раўназначныя.

Беларускі палітычны дыскурс канца 1920-х – пачатку 1930-х гг. патрабуе дэталёвага аналізу, паколькі звязаны з часам, які вызначаўся савецкай афіцыйнай гістарыяграфіяй як перыяд пачатку разгорнутага наступлення сацыялізму па ўсім фронце на аснове рэканструкцыі галін народнай гаспадаркі. Складнікамі гэтага працэсу, адметнага наяўнасцю дзвюх парадыгм тэкстаў – энкратычнай (улады) і акратычнай (іншадумства), былі барацьба з «нацыянал-дэмакратызмам» і ліквідацыя «апошняга эксплуататарскага класа» – заможнага сялянства (кулацтва). Мы абмежаваліся сямю «пераломнымі» гадамі (1926–1932) – часам своеасаблівага «перавароту» не толькі ў межах палітычнай сістэмы, але і грамадскай свядомасці – спецыфічнай «рэвалюцыі зверху», якой спрыяла і адпаведная сістэма палітычных тэкстаў, і эканамічная сітуацыя ў краіне.

Пад *палітычным тэкстам* мы разумеем вербалізаваную палітычную дзейнасць ва ўсіх яе праявах: як знакавых, сімвалічных (намінатыўная і акумулятыўная дзейнасць), так і несімвалічных (тэксты-перфарматывы). Гэтае паняцце ахоплівае рэалізаваныя ў маўленні тэматычны аб'ём і стылявыя асаблівасці палітычнай актыўнасці грамадства. *Палітычны дыскурс* – гэта сукупнасць палітычных *дыскурсій* (сацыяльна-дыферэнцыраваных маўленчых практык) соцыуму: дыскурса ўлады (*энкратычнага*), контрдыскурса (*акратычнага*), публічнай рыторыкі, якія або замацоўваюць стабільнасць пэўнай сістэмы грамадскіх узаемадачыненняў або дэстабілізуюць яе. Абраны для аналізу дыскурс вызначаецца дынамізмам, паколькі кожнаму змяненню грамадскай свядомасці, кожнай ідэалагічнай варыяцыі адпавядае новая сістэма тэкстаў. Любы палітычны лад стварае спецыфічную маўленчую практыку, імкнучыся сцвердзіць яе ў якасці універсальнай і падпарадкаваць іншыя маўленчыя практыкі.

Факталагічнай асновай артыкула паслужылі дакументы ЦК КП(б)Б, акругкомаў, шэрага райкомаў і ячэек КП(б)Б: рашэнні з'ездаў, пленумаў, бюро,



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

сакратарыятаў, дырэктыўныя ўказанні аддзелаў ЦК КП(б)Б, выступленні партыйных, дзяржаўных і грамадскіх дзеячаў, навукова-творчых работнікаў, інфармацыйныя і іншыя паведамленні ДПУ БССР, пахвальныя і выкрывальныя артыкулы прэсы, матэрыялы разгляду «партыйных спраў», лісты ў партыйныя органы, заявы, змешчаныя ў зборніку дакументаў «На крутым павароце: Ідэолага-палітычная барацьба на Беларусі ў 1929–1931 гг.» (Мінск, 1999). Дадзены матэрыял дазваляе вылучыць і супаставіць дзве маўленчыя практыкі – дыскурсію ўлады (энкратычную), контрдыскурсію (акратычную) – і вызначыць правілы, што абумовілі «моўную гульню» ўлады.

Сінтэзуючы і развіваючы ідэі папярэдніх мадэлей генерыравання маўлення (ГМ), прапанаваных Т. Вінаградам, Л. Выгоцкім, С. Кацнельсонам, Ч. Філмарам, У. Чэйфам, М. Мінскім (гл. Виноград 1983, Выготский 1934, Кацнельсон 1972, Филлмор 1988, Чейф 1983, Mynsky 1975), мы дапускаем магчымасць стварэння прынцыпова іншай мадэлі тэкстаўтварэння – мадэлі з актуалізаванай стадыяй фарміравання зместу пры адсутнасці падзелу на перадмаўленчыя і маўленчыя этапы, паколькі мысліцельны змест на любой стадыі мае свой моўны карэлят.

Наша меркаванне грунтуецца на наступных тэзісах:

1) мысліцельныя працэсы – гэта працэсы маніпуліравання ведамі, падчас якіх нараджаецца новае «мысленчае ўтварэнне», што не толькі дазваляе самому суб'екту мадэляваць уласную карціну свету, але і паўплываць на карціну свету адрасата. Пад «карцінай свету» разумеецца ўяўленне аб сувязі сутнасцей у навакольным свеце, аб іх іерархіі і вартаснай значнасці для суб'екта, які ўспрымае свет;

2) мысліцельныя працэсы – не з'яўляюцца чыста інтэлектуальным механізмам. Набыццё ведаў суправаджаецца ацэнкай свету, якая папярэднічае эмоцыям і выклікаецца адпаведнасцю / неадпаведнасцю навакольнага свету запытам, установкам суб'екта. З гэтага вынікае, што неабходным складнікам мысліцельных працэсаў з'яўляецца або эмацыянальна-ацэначны кампанент (прагматычны аператар), або паўтор аднолькавых пасылак, што атрымалі ў тэксце рознае рытарычнае забеспячэнне (ланцужкі сілагізмаў);

3) асноўнымі адзінкамі, у межах якіх структуруюцца веды, з'яўляюцца фрэйм і сцэнар. Структура ведаў пра абагульненыя (недэталізаваныя) сітуацыі і стэрэатыпныя іх уяўленні, абазначаная тэрмінам *«фрэйм»*, дазваляе суаднесці з ім самыя розныя прадукты чалавечага мыслення, якія можна называць па-рознаму («ідэі», «паняцці», «канцэпты»). Гэта – пэўныя веды чалавека аб рэчаіснасці, яе складніках і перспектывах. *Сцэнар* інтэрпрэтуецца намі як кагнітыўная структура, якая мае ў дыскурсе моўны карэлят – метафару.

Такая мадэль ГМ палітычнага дыскурса можа выкарыстоўвацца як мадэль аналізу тэксту ў накірунку, адваротным працэсу тэкстаўтварэння – ад рытарычна афармленага тэксту да базавых ідэй, пакладзеных у яго генерыраванне (Чахоўскі 2002, 185–201).

Аналіз паказвае, што дыскурс абапіраецца на шэраг бінарных апазіцый, адзін скпаднік якіх мае пазітыўны характар, а другі – негатыўны – гэтым адлюстроўваецца механізм улады ў дыскурсіі, паколькі выяўляецца вызначальная роля пазітыўных элементаў. Працэс стварэння палітычнага дыскурса, паводле нашага назірання, адбываецца наступным чынам: пэўная падзея, значная з грамадскага пункта погляду, ацэньваецца праз вартасныя апазіцыі ідэй, што існуюць у дадзеным тыпе грамадскай свядомасці і з'яўляюцца стымулам да разгортвання іх у дыскурсе. Апасродкаваныя канцэптуальныя метафары скіроўваюць рух дыскурса, ствараюць умовы для зместавага напаўнення прапазіцый, стымулююць найбольш значныя намінацыі і тропы.

Палітычны дыскурс грунтуецца на апалогіі тых або іншых ідэй, паняццяў, пакладзеных у аснову ўладнай стратэгіі, супрацьпастаўленай іншым ідэям.



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

Некаторая вартасная сетка, што складаецца мінімум з адной апазіцыі, прынятай у сацыяльным асяроддзі, актывізуе ў свядомасці моўнай асобы стымул грамадскай значнасці, уласцівы адпаведнай грамадскай з'яве. Апошняя кваліфікуе падзею з пункта гледжання сацыяльнага заказу. З пазіцый актывізаваных кагнітыўных структур апазіцыі ўяўляюць фрэймы – веды пра абагульненыя (не дэталізаваныя) сітуацыі і стэрэатыпныя іх уяўленні.

Мы разглядаем дзве парадыгмы тэкстаў (улады і іншадумства), аб'яднаных тым, што яны звязаны з пэўнымі падзеямі грамадскага жыцця, аднак супрацьпастаўленых неаднолькавым стаўленнем да гэтых падзей, што можа сведчыць пра наяўнасць двух тыпаў моўных асоб.

Цэнтральнай апазіцыяй дыскурса ўлады з'яўляецца апазіцыя **нацыяналізм – інтэрнацыяналізм**. Другая бінарная апазіцыя свядомасці – **калектывізм – індывідуалізм** – звязана з папярэдняй і складае даволі значную частку тэкстаў прааналізаванага перыяду.

Прагматыкон моўнай асобы энкратычнага дыскурса падаецца праз 2 вартасныя апазіцыі ідэй: **нацыяналізм (-) – інтэрнацыяналізм (+)**, **калектывізм (+) – індывідуалізм (-)**. У тэрмінах гэтых вартасных апазіцый моўная асоба дыскурса ўлады ўяўляе сябе як інтэрнацыяналіста і калектывіста, а Іншага – як нацыяналіста і індывідуаліста. Тэзаўрус гэтай моўнай асобы, які адлюстроўвае яе светабачанне, прадстаўлены наступнымі базавымі метафарамі: **свет (БССР) – фронт барацьбы паміж нацыяналізмам і інтэрнацыяналізмам**, **калектывізм – норма жыцця**.

У карціне свету (яе спрошчанай мадэлі), якая складаецца са сцэнараў і вынікаў, свет паўстае арэнай барацьбы дзвюх сіл, дзе «перадавыя» сілы прадстаўлены прыхільнікамі савецкай улады, а «неперадавыя» – яе антаганістамі, перамога сацыялізму з'яўляецца непазбежнай, таму «прагрэсіўныя» сілы поўняцца аптымізмам, а «непрагрэсіўныя» будуць вымушаны прызнаць сваё паражэнне. З першай апазіцыяй звязана асаблівасць: часы найвышэйшых каштоўнасцей – гэта падзеі Кастрычніцкай (1917 г.) рэвалюцыі, стварэнне БССР (1919 г.) і ўмацаванне савецкай улады ў Беларусі, калі праяўляліся найлепшыя якасці чалавека, і будучыня – перамога сацыялізму. У такой карціне свету любы пабочны назіральнік (Іншы), які не ўдзельнічае ў барацьбе двух лагераў, варты асуджэння, як і той, хто з'яўляецца носьбітам настрояў тугі і песімізму, паколькі гэта не супадае з адчуваннем гістарычнай перспектывы, а, значыць, можа быць звязана з недаверам да яе. Індывід з'яўляецца моцным і вартым увагі толькі тады, калі ён дзейнічае супольна з калектывам перадавых людзей; агульная справа патрабуе бязлітаснасці ў дачыненні да яе ворагаў. Ворагамі ж з'яўляюцца тыя, хто спрабуе ўсумніцца ў перамозе і неаспрэчнасці «агульнай ідэі».

У працэсе тэкстаўтварэння адбываецца ўзаемаперасячэнне апазіцый так, што адзін фрагмент тэксту можа тлумачыцца дзеяннем другой апазіцыі: **нацыяналізм – інтэрнацыяналізм** укпючае **калектывізм – індывідуалізм** і наадварот. Да асаблівасцей граматыкона моўнай асобы энкратычнага дыскурса, звязанага з першымі двума ўзроўнямі, належаць: наяўнасць мілітарызаваных метафар і імёнаў, што маюць дачыненне да ваеннай тэматыкі (напрыклад, *«вораг»*, *«здраднік»*, *«шпіён»*, *«фашыст»*), выкарыстанне займенніка *«наш»* у якасным значэнні; выкарыстанне зборных назоўнікаў і назоўнікаў множнага ліку, якія рэферыруюць да ўсяго класа, пабудова тэксту, пры якой *«я»* моўцы замяняецца на *«мы»*, якое абазначае «ўсіх людзей»: *«Як-жа* ***мы*** *іх падрыхтоўваем? Баліцкага ў НКАсветы можна замяніць Платуном, больш вытрыманым бальшавіком, Прышчэпава замянілі Рачыцкім – знайшлі, аказваецца... А што датычыць акадэміі, дык там ёсць рагаткі, гавораць, што ў* ***нас*** *няма вучоных. Ці не пара* ***нам****, тав. Гамарнік, абвясціць мабілізацыю хаця б ста, пры* ***нашай*** *беднасці, камуністаў, і накіраваць іх у НКАсветы спецыяльна для культурнага ідэалагічнага фронту?»* (На крутым павароце... 1999, 133).



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.

To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

У рэчышчы рытарычных прыёмаў намі вылучаны *рытарычныя элементы-канцоўкі*: «выражэнне ўпэўненасці ў будучыні» і «патрабаванне самай суровай кары для ідэалагічных іншадумцаў» – сінтаксічна афармленыя структуры, якія сустракаюцца ў большасці тэкстаў грамадскага накірунку і пэўным чынам рэалізуюць інтэнцыю моўцы. У дачыненні да дыскурса ўлады адзначаецца наяўнасць дыскурса-стымулу, які пачынае ідэалагічную кампанію, прадвызначае тон і зыходзіць непасрэдна ад людзей, упаўнаважаных уладай, і дыскурса-рэакцыі. У такім дыскурсе вылучаюцца рытарычныя элементы-перакананні, якія пабуджаюць рэцыпіента катэгарызаваць рэчаіснасць у пэўным ракурсе: *«выяўляць і забяспечваць умовы развіцця пачынаючым рабочым пісьменнікам, уцягваць іх у свае шэрагі, яшчэ шырэй разгортваць заклік рабочых-ударнікаў у літаратуру, арганізоўваць дзесяткі літаратурных гурткоў, студый, семінараў, – выхоўваць новыя кадры пралетарскай літаратуры»* (На крутым павароце... 1999, 295).

У дыскурсе-рэакцыі вылучаюцца рытарычныя элементы-пацвярджэнні, якія адлюстроўваюць фрагменты энкратычнага дыскурса і такім чынам сігналізуюць аб ухваленні пазіцый улады: *«Працоўныя Савецкай Беларусі вітаюць прыгавор Вярхоўнага суда УССР. Рабочыя і працоўныя сяляне Савецкай Беларусі разам з гэтым улічаць усе палітычныя ўрокі гэтага працэсу над украінскай контррэвалюцыяй»* (На крутым павароце... 1999, 224).

Адсутнасць у прагматыконе моўнай асобы акратычнага дыскурса названых апазіцый ідэй – **нацыяналізм – інтэрнацыяналізм**, **калектывізм – індывідуалізм** – можа сведчыць аб тым, што моўная асоба дыскурса іншадумства або пагаджаецца з існаваннем гэтых супрацьпастаўленняў (*«Я гэтага не ведаў, і ў даным выпадку скажу: увесь гэты артыкул заключаў, безумоўна, грубую памылку ў тым, што мне не прышлося ўлічыць сітуацыю, якая зараз маецца ў Заходняй Беларусі... У даным выпадку я зараз абсалютна згодзен з тым, што гэта ёсць памылка»* (На крутым павароце... 1999, 101)), або не лічыць патрэбным канфрантаваць па іх з прычыны надзвычайнай укаранёнасці адпаведнай пазіцыі.

Моўная асоба акратычнага дыскурса на падставе прааналізаваных тэкстаў усведамляе сябе, як і моўная асоба дыскурса ўлады, – як антышавініста І калектывіста, але, у адрозненне ад папярэдняй, устрымліваецца ад абвінавачанняў на адрас Іншага – як шавініста і індывідуаліста.

Тэзаўрус моўнай асобы контрдыскурса пазбаўлены базавых метафар. Мадэль свету, якая рэканструюецца ў дыскурсіі, выглядае наступным чынам: краіна ўпэўнена будуе сацыялізм, на яе шляху могуць узнікаць перашкоды ў гэтым будаўніцтве, але іх сапраўдная прычына – «памылкі» некаторых грамадзян, якія можна лёгка выправіць, паколькі яны не з'яўляюцца фатальнымі. Мэты моўнай асобы іншадумства заключаюцца ў тым, каб дапамагчы пазбавіцца гэтых памылак, а таксама *«отмежеваться от провокационной тактики, навязанной нам представителями ОГПУ в нашей среде»* (На крутым павароце... 1999, 78).

Моўнае забеспячэнне тэксту характарызуецца: 1) адсутнасцю ўсіх тых з'яў, якія маюцца ў дыскурсе ўлады; 2) неспалучэннем «я» з абагульненым суб'ектам.

Паміж моўнымі асобамі дыскурса ўлады і контрдыскурса назіраецца прынцыповая розніца ў характары мысліцельных працэсаў: асобе энкратычнага дыскурса ўласціва метанімічная замена часткай пэўнага цэлага, якая адлюстроўваецца ў самых розных сферах як маўленчых, так і немаўленчых паводзін: погляд на крытыку асобных недахопаў як на крытыку цэлага, магчымасць падмены «Я» дзяржаўных інстытутаў, ад імя якіх гэтае «Я» спрабуе гаварыць; моўная асоба контрдыскурса настойвае на размежаванні гэтых з'яў – часткі і цэлага. Кагнітыўны канфлікт – прычына грамадскіх канфліктаў – мае semiятычны характар і суправаджаецца розным тлумачэннем адных і тых жа слоўных азначальных («інтэрнацыяналізм», «калектывізм»).



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

Агульнай інтанацыяй двух дыскурсаў паўстае стаўленне да пачуццяў як да аб'екта, вартага апісання ў найбольш значных для ўспрымання пазіцыях тэксту – пачатку і канцы. Для дыскурса ўлады выражэнне пачуццяў робіцца той падставай, дзякуючы якой улада атрымлівае ад народа сігнал аб ухваленні яе ўчынкаў.

Аналізаваныя камунікатыўныя аспекты палітычнага дыскурса ў Беларусі дазваляюць меркаваць пра дваістую карціну свету, якая характарызуе стан свядомасці грамадства перыяду 1920–1930-х гг.

ЛІТАРАТУРА

Виноград Т. К процессуальному пониманию семантики // Новое в зарубежной лингвистике. М., 1983. Вып. 12.

Выготский Л.С. Избранные психологические исследования. М., 1934.

Кацнельсон С.Д. Типология языка и речевое мышление. Л., 1972.

На крутым павароце: Ідэолага-палітычная барацьба на Беларусі ў 1929–1931 гг.: Дакументы, матэрыялы, аналіз / Аўт.-склад. Р.П. Платонаў. Мн., 1999.

Филлмор Ч. Фреймы и семантика понимания // Новое в зарубежной лингвистике. М., 1988. Вып. 23.

Чахоўскі Г.К. Кагнітыўны аналіз палітычнага дыскурса ў Беларусі 1920–1930-х гг. // Працы кафедры сучаснай беларускай мовы (да 80-годдзя БДУ) / Пад рэд. А.Я. Міхневіча. Мн., 2002. Вып. 1.

Чейф У.Л. Память и вербализация прошлого опыта // Новое в зарубежной лингвистике. М., 1983. Вып. 12.

Mynsky M. A Framework for Representing Knowledge. Winston, 1975.

Паступіў у рэдакцыю 13.06.2002.

***Георгій Канстанцінавіч Чахоўскі*** – выкладчык кафедры сучаснай беларускай мовы.

*И.Н. СОФРОНОВА*

## ВЗАИМОДЕЙСТВИЕ ЯЗЫКОВЫХ ФАКТОРОВ И ГЕНДЕРНЫХ СТЕРЕОТИПОВ В ПРОЦЕССЕ ФОРМИРОВАНИЯ ОБРАЗА МУЖЧИНЫ

Описываются результаты социолингвистического эксперимента, цель которого – выявить, с лицом какого пола реально соотносятся существительные общего рода в сознании говорящих на русском языке.

The results of a sociolinguistic experiment are presented. The experiment is aimed at revealing which sex is actually attributed to common gender nouns in the mind of Russian native speakers.

Исследование грамматической категории рода является традиционным направлением для русистики, в рамках которого изучаются способы номинации лиц разного пола, соотношение интра- и экстралингвистических факторов, влияющих на процессы словопроизводства в исторической перспективе. При этом менее изученными в гендерном аспекте оказались существительные общего рода, имеющие, как известно, синтаксическое выражение родовых характеристик. Вероятно, отсутствие однозначной референции определило периферийную позицию существительных общего рода в кругу гендерно релевантных наименований лиц. Однако именно синкретизм в обозначении пола, свойственный существительным общего рода, делает последние весьма интересным объектом для социолингвистической интерпретации.

Мы предположили, что специфика конкретной референции существительных общего рода, обозначающих лиц по наиболее характерным действиям или свойствам, оказывается в зависимости не столько от языковых, сколько от экстралингвистических факторов, в частности от пола говорящего и гендерных стереотипов. Для проверки данного предположения нами был проведен эксперимент, цель которого состояла в том, чтобы определить, в какой степени действия и свойства, носителями которых являются лица, обозначенные существительными общего рода, дают возможность думать о мужчине или о женщине. При этом изначально предполагалось,



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm